Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# СПРАВАЗДАЧА КААРДЫНАЦЫЙНАГА КАМІТЭТА БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПЛАТФОРМЫ ФОРУМА ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА (2014-2015)

*Падрыхтавана да Канферэнцыі БНП*
*"Грамадзянская супольнасць Беларусі:*
*выклікі застою і адзяржаўлення трэцяга сектара",*
*г. Мінск, 25 чэрвеня 2015 года*

Склад Каардынацыйнага камітэта БНП, які дзейнічаў у 2014-2015 гг:

- Андрэй Ягораў - Старшыня Каардынацыйнага камітэта і Нацыянальны каардынатар
- Яраслаў Бекіш
- Аксана Шэлест
- Васіль Валасюк
- Наталля Васілевіч
- Таццяна Пашавалава
- Ігар Рынкевіч

## Дзейнасць Каардынацыйнага камітэта ў 2014-2015 годзе, асноўныя прыярытэты

Дзейнасць Каардынацыйнага камітэту ў 2014-2015 гг. канцэнтраваіся на наступных кірунках:

1. Структурныя рэформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнерства напярэдадні штогадовага Форуму ў Батумі (лістапад, 2014);
2. Удзел у фармаванні новай Стратэгіі ФГС УП на 2015-2017 гг.;
3. Камунікацыя з афіцыйнымі структурамі ЕС адносна ўзаемадзеяння з грамадзянскай супольнасцю Беларусі ў кантэксце ўзнаўлення дыялогу з уладамі Беларусі;
4. Падтрымка дзеянняў Грамадскага Балонскага камітэта ў працэссе перамоваў аб уступленні Беларусі ў еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі;
5. Праца ў межах праекта РЭФОРУМ (працягу Еўрапейскага дыялогу па мадэрнізацыі);
6. Пазыцыянаванне БНП ФГС УП адносна ключавых пытанняў развіцця беларуска-еўрапейскіх адносінаў і ўнутранай сітуацыі ў краіне;
7. Унутранныя пытанні існавання і стратэгіі БНП.

Беларуская нацыянальная платформа актыўна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы, абмеркаванні і прыняцці рашэнняў па структурных рэформах Форуму грамадзянскай супольнасці і новай Стратэгіі ФГС на 2015-2017 гг. У выніку рэформаў, што зацьвердзіў штогадовы Форум у Батумі (лістапад, 2014) структура кіравання ФГС была спрошчаная і аптымізаваная (зменьшылася колькасць сябраў

Кіраўнічага Камітэту ФГС УП, уведзеныя Саветы Працоўных Групаў з прадстаўніцтвам нацыянальных тэматычных каардынатараў і г.д.), узмацнілася роля Нацыянальных платформаў, праца тэматычных групаў праз Саветы Працоўных Групаў была больш прывязаная да нацыянальных кантэкстаў краін УП. Новая Стратэгія ФГС амаль поўнасцю ўключыла тыя стратэгічныя пазыцыі, што былі прапанавыя Беларускай нацыянальнай платформай.

Камунікацыя КК БНП з афіцыйнымі структурамі ЕС была дастаткова складанай, што абумоўлена працэссам узнаўлення дыялогу ЕС з беларускімі ўладамі і абмеркавання фармату прамежкавай фазы двухбаковых адносінаў (пры катэгарычным нежаданні беларускіх уладаў бачыць грамадзянскую супольнасць адным з бакоў гэтага працэсу). Пры тым, што БНП пазытыўна ставілася і ставіцца да дыялогу, мы падкрэслівалі неабходнасць уключэння голасу грамадзянскай супольнасці Беларусі і, ў прыватнасці, БНП, у ход перамоваў. Да гэтага часу праблема засталася не вырашанай і арганізацыі грамадзянскай супольнасці не маюць інстытуцыйнай магчымасці ўплываць на прыняцце рашэнняў. Пры гэтым можна канстатаваць большую адкрытасць Прадстаўніцтва ЕС у Мінску, амбасадаў краін ЕС і афіцыйных дэлегацыяў да кантактаў з БНП, чым гэта было ў папярэдні перыяд 2012 г. – сярэдзіны 2014 гг.

Вялікім дасягненнем беларускай грамадзянскай супольнасці, Грамадскага балонскага камітэта і Беларускай Нацыянай платформы стала ўключэнне Беларусі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі (ЕПВА) на падставе неабходнасці правядзення рэформаў вышэйшай адукацыі (адпаведна “дарожнай мапе” рэформаў). Гэта сталася магчымым праз супрацу Балонскага камітэта і Нацыянальнай платформы ў актыўным лабіяванні неабходнасці рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі на ўзроўні Сакратарыята ЕПВА, Еўрапейскай камісіі, Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў, краінаў-сябраў ЕС.

Сябры КК Н. Васілевіч і І. Рынкевіч былі дэлегаваныя у якасці прадстаўнікоў БНП у працы “Форуму грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазыцыі” у праекце “Рэфорум”, дзе яны здолелі пралабіяваць важнасць інфармацыйнага накірунка (па свабодзе СМІ).

БНП прыняла шэраг заяваў і зваротаў адносна развіцця Усходняга парнерства, сітуацыі вайсковай агрэсіі супраць Украіны, рэпрэсіяў супраць актывістаў беларускай грамадзянскай супольнасці, Саміту УП і еўрапейскай перспектывы для краін УП.

Палажэнне БНП заставалася крызісным, дасягненні Нацыянальнай платформы па-ранейшаму дастаткова малыя, яе задачы па ўзмацненні грамадзянскай супольнасці, яе кансалідацыі і ўплыву на развіцце краіны застаюцца не вырашанымі. На працягу гэтага года неаднаразова ўзнікалі ўнутраныя дэбаты пра магчымае прыпыненне дзейнасці Беларускай Нацыянальнай платформы. Сярод асноўных чыннікаў крызісу БНП застаюцца тыя, што былі агучаныя у мінулагодняй справаздачы з некаторымі дадаткамі:

- Стагнацыя самой ініцыятывы Усходняга партнёрства з-за неадпаведнага ўзроўню ўдзелу, а часам і руху “у адваротны бок” шэрагу краін-удзельніц (Арменія, Азербайджан, Беларусь);
- Інтэнсіўны і шматузроўневы крызіс в Украіне, які закрануў рэгіён УП, еўраструктуры і грамадзянскую супольнасць;
- Незацікаўленасць і перасцярогі ў супрацоўніцтве з БНП з боку Дэлегацыі ЕС у Беларусі, нізкі ўзровень успрыняцця прапановаў БНП еўрачыноўнікамі з Брусэлю;
- Імкненне ЕС да безумоўнай камунікацыі з беларускімі ўладамі і змена вектару на палітыку “уцягвання” пры адсоўванні інтэрэсаў пра-еўрапейскай грамадзянскай супольнасці ў бок;

- Нізкая актыўнасць і малаініцыятыўнасць удзельнікаў БНП, засяроджанасць на праектнай дзейнасці і вузкіх праблемах, няздольнасць працаваць пра-актыўна ў неспрыяльных умовах.

## Актуальны склад БНП

На сёняшні дзень колькасць сталых удзельнікаў БНП складае 70 арганізацый, такім чынам колькасць у параўнанні з мінулым годам павялічылася на 2 арганізацыі.

## Сустрэчы Каардынацыйнага камітэта

Адбылося 5 паседжанняў КК, на ўсіх меўся кворум для прыняцця рашэнняў. На пачатку дзейнасці КК вырашылі вызначыць адказных па пэўных накірунках дзейнасці, але механізм падзялення функцый і нясення адказнасці сябрамі КК спрацаваў недастаткова эфектыўна.

На паседжаннях КК былі актуалізаваныя пытанні працы БНП над Нацыянальнай канцэпцыяй сацыяльна-эканамічнага устойлівага развіцця і маніторынгу замежнай (еўрапейскай) дапамогі Беларусі, што патэнцыяльна могуць быць асновай рэгулярных публічных справаздач БНП. Важным накірункам дзейнасці КК стала спрыянне працы тэматычных накірункаў Саветаў Працоўных груп, у тым ліку для іх удзелу ў фармаванні прыярытэтаў конкурсу на падтрымку праектаў у рамках Працоўных груп ФГС УП (рэгранцінг). Шмат увагі было нададзена падрыхтоўцы ўдзелу дэлегацый БНП у Форуме ў Батумі, саміту УП у Рызе ды іншых міжнародных мерапрыемствах.

На апошніх паседжаннях КК абмяркоўвала пытанні аб унутраным стане БНП, аб стратэгіі БНП у цяперашніх умовах, аб тым, што рабіць БНП да і падчас "прэзідэнцкіх выбараў". Вызначылі, што БНП трэба прадэклараваць сваю пазіцыю (няўдзел у выбарах, мірны працэс ды інш.) і рыхтавацца да любых сцэнароў развіцця падзей, ад мяккага варыянта паслявыбарнага дыялога ЕС з кіруючым рэжымам да варыянта магчымых рэпрэсій улады супраць дэмакратычнай грамадскасці.

# Дзейнасць у межах агульна-Форумнага праекта па развіцці Нацыянальных платформаў

Частка актыўнасці Беларускай нацыянальнай платформы адбывалася ў межах праекта па развіцці Нацыянальных платформаў краінаў Усходняга партнёрства, які быў падтрыманы Еўрапейскай камісіяй. У межах гэтага праекту з 3 ліпеня 2014 па чэрвень 2015 былі падтрыманыя:

**1. Круглы стол "Аб стане і разьвіцьці малога бізнэсу ў сфэры паслугаў: погляд спажыўцоў. Праблема даступнасці для людзей з інваліднасьцю", Мінск, 6 жніўня 2014 г.**

Падчас круглага стала прадстаўнікі ўлады, бізнэс-асацыяцыяў, прафсаюзаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці абмеркавалі стан справаў і развіццё малага бізнэсу ў сферы паслугаў з пункту гледжання даступнасці людзей з інваліднасцю.
http://npbelarus.info/?p=1612

Круглы стол праводзіўся ў межах Рабочай Групы №5 Форума грамадзянскай супольнасці УП. Па выніках абмеркавання была падрыхтаваная аналітычная нататка, якая была дасланая ўладам і іншым зацікаўленым суб'ектам.
http://npbelarus.info/?p=1709

**2. Круглы стол "Роля сацыяльнага партнёрства ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны", Мінск, 27 жніўня 2014 г.**

Круглы стол адбыўся на базе Беларускай асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (БелАПП). Удзельнікамі дыскусіі сталі звыш 20-ці прадстаўнікоў усіх бакоў сацыяльнага партнёрства – ураду, на чале з намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыям Кавальковым, аб'яднаннем наймальнікаў, прафсаюзаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці.".
http://npbelarus.info/?p=1638

Круглы стол праводзіўся ў межах Рабочай Групы №5 Форума грамадзянскай супольнасьці УП. Па выніках абмеркавання была падрыхтаваная аналітычная нататка, якая была дасланая ўладам і іншым зацікаўленым суб'ектам.
http://npbelarus.info/?p=1694

**3. Сустрэча беларускіх дэлегатаў Форума грамадзянскай супольнасці, Мінск, 12 лістапада 2014 г.**

Сустрэча дэлегатаў Форума адбылася напярэдадні VI Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга парнёрства "Інтэграцыя з ЕС і агульная бяспека: зробім гэта магчымым". Мэтай мерапрыемства было абмеркаванне і ўзгадненне дзеянняў беларускай дэлегацыі на Форуме, які пройдзе 20-21 лістапада ў Батумі (Грузія).
Удзельнікі сустрэчы скаардынавалі задачы беларускай дэлегацыі на будучым Форуме грамадзянскай супольнасці УП. Дэлегаты абмеркавалі і падтрымалі новую Стратэгію Форума грамадзянскай супольнасці на пэрыяд 2015-2017 гг., прапанаваную Кіруючым камітэтам.
http://npbelarus.info/?p=1758

**4. Круглы стол "Кіруючыя прынцыпы АБСЭ па абароне праваабаронцаў", Мінск, 8 снежня 2014 г.**

У межах Рабочай групы №1 Форума грамадзянскай спольнасці УП прайшоў круглы стол, прысвечаны прыняццю Кіруючых прынцыпаў OSCE/EDIHR па абароне праваабаронцаў, на якім былі абмеркаваная роля гэтага дакумента дзеля ўмацавання праваабарончай супольнасці ў Беларусі.

**5. Канферэнцыя БНП, Мінск, 22 снежня 2014 г.**

Канферэнцыя Беларускай нацыянальнай платформы "Інвентарызацыя і пераацэнка патэнцыялу праграмы Усходняга партнёрства для развіцця беларускай грамадзянскай супольнасці" была прысвечаная пытанням аб прызначэнні платформы і ўзмацненні яе ўдзельнікаў у бліжэйшай перспектыве. На канферэнцыі таксама былі падведзены вынікі VI Форума грамадзянскай супольнасці, які праходзіў у Батумі, і магчымыя пагрозы для развіцця НП з-за прагматызацыі адносінаў паміж Эўразвязам і "праблемнымі" краінамі Усходняга Партнёрства.
http://npbelarus.info/?p=1859

**6. Круглы стол "Праблемныя пытанні ІП для адлюстравання ў Нацыянальнай платформе бізнесу Беларусі-2015", Мінск, 9 лютага 2015 г.**

У межах Рабочай групы №2 Форума грамадзянскай супольнасці УП адбыўся круглы стол "Праблемныя пытанні ІП для адлюстравання ў Нацыянальнай платформе бізнесу Беларусі-2015". Бізнес-супольнасць ініцыявала правядзенне круглага стала ў сувязі з нарастаннем праблем прадпрымальніцтва, а таксама таму, што праблемныя пытанні ІП пакуль не атрымалі комплекснага

адлюстравання. Неабходнасць аналізу і абмеркавання праблемных пытанняў ІП асабліва актуальная сёння, у кантэксце адвокасі, унясення бізнес-асацыяцыямі кансалідаваных прапаноў у Праграму дзейнасці ўрада РБ на 2015 год, стварэння «Нацыянальнай платформы бізнесу Беларусі-2015» (НППБ), ўзаемадзеяння - дзелавой супольнасці з арганізацыямі ГА.
http://npbelarus.info/?p=2006

7. **Працоўная сустрэча прадстаўнікоў БНП з кансультантам шведскага агенцтва развіцця СІДА, Мінск, 18 сакавіка 2015 г.**

Адбылася сустрэча прадстаўнікоў БНП з кансультантам шведскага агенцтва развіцця СІДА Цімам Вікеры, які прыехаў у Беларусь, каб сабраць меркаванні беларускіх прадстаўнікоў платформы наконт аспектаў яе функцыянавання, з мэтай дасягнення лепшых вынікаў.
http://npbelarus.info/?p=2153

**8. Працоўнае пасяджэнне ўдзельнікаў БНП у межах Рабочай групы №4 Форума грамадзянскай супольнасці УП "Кантакты паміж людзьмі", Мінск, 10 красавіка 2015 г.**
На пасяджэнні адбыўся абмен інфармацыяй, датычнай дзеянняў арганізацый грамадзянскай супольнасці ў межах 4-й Рабочай групы на нацыянальным і міжнародным узроўні, абмеркаваныя бліжэйшыя планы арганізацыяў і магчымыя супольныя дзеянні ў межах групы, а таксама дамоўлена пра каналы камунікацыі паміж арганізацыямі.

**9. Круглы стол "Усходняе партнерства напярэдадні Рыжскага Саміту: выклікі і задачы для грамадзянскай супольнасці Беларусі", Мінск, 5 траўня 2015 г.**
Прадстаўнікі арганізацый грамадзянскай супольнасьці меліся абмеркаваць актуальную сітуацыі ва Усходнім парнерстве, даць ацэнку развіцця адносінаў паміж Беларуссю і ЕС, а таксама выпрацаваць супольную пазіцыю ўдзельнікаў Нацыянальнай платформы па пытаннях рэвізіі Еўрапейскай палітыкі суседства, еўрапейска-беларускіх адносінаў, развіцця ініцыятывы Усходняга парнёрства.
http://npbelarus.info/?p=2226

**10.Сустрэча 1-й Рабочай групы, Мінск, 5 чэрвеня 2015 г.**
На сустрэчы прадстаўнікі беларускай Рабочай групы №1 далі ацэнку Рыжскаму саміту і вызначыліся з прыярытэтамі напярэдадні агульнай сустрэчы групы ў Брусэлі.
http://npbelarus.info/?p=2404

## Іншыя ініцыятывы і дзеянні ў межах БНП за апошні год

### Удзел КК і БНП у кансультацыях у Беларусі:

25 ліпеня 2014 г. адбылася сустрэча з прадстаўнікамі Сената і платформы "За новы ЕГУ", дзе абмярковалася сітуацыя крызісу ЕГУ і парушэння акадэмічных свабодаў ва універсітэце.

2 снежня 2014 г. прайшла сустрэча КК БНП са стραршыней дэпартамента двухбаковых адносінаў Усходняга партнерства Еўрапейскай службы знешніх дзянняў Дзіркам Шубелем і прадстаўнікамі Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі.

18 сакавіка 2015 г. адбылася сустрэча Каардынацыйнага камітэта і Нацыянальнай платформы з кансультантам шведскага агенцтва развіцця СІДА Цімам Вікеры (Tim Vickery) па пытаннях магчымай падтрымкі дзейнасці нацыянальных платформаў.

19 сакавіка Амбасада Рэспублікі Польша пры падтрымцы КК БНП арганізавала сутрэчу прадстаўнікоў беларускіх НДА з дэлегацыяй спецыяльных прадстаўнікоў МЗС краінаў ЕС па Усходнім парнерстве.

4 траўня 2015 г. КК БНП прыняў удзел у кансультацыях Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі па пытаннях рэвізіі палітыкі суседства.

На працягу года прадстаўнікі КК БНП удзельнічалі ў сустрэчах грамадзянскай супольнасці Беларусі з прадстаўнікамі струтураў ЕС і МЗС краінаў-сябраў ЕС, у прыватнасці з працоўнай групай па Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі COEST, дэлегацыяй Еўрапейскага парламенту па адносіх з Беларуссю, МЗС Латвіі і інш.

## Заявы, звароты і пазіцыі БНП

За справаздачны перыяд КК і БНП прынялі шэраг дакументаў, якія прадстаўляюць пазіцыю БНП па шырокім коле пытанняў як па сітуацыі ўнутры краіны, та і ў міжнародным кантэксце, а менавіта:

2014/06/27. Заява Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства ў сувязі з падпісаннем Грузіяй, Малдовай і Украінай пагадненняў аб асацыяцыі з ЕС // http://npbelarus.info/?p=1370

2014/11/03. Заява "Пра салідарнасць з праваабаронцай Алёна Танкачовай" // http://npbelarus.info/?p=1743

2015/03/05. Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства "Аб дзеяннях міжнароднай супольнасці з нагоды ваеннага канфлікту на ўсходзе Украіны» // http://npbelarus.info/?p=2025

2015/03/06. Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства "У сувязі з забойствам Барыса Нямцова» // http://npbelarus.info/?p=2016

2015/04/15. Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства "Аб прызнанні еўрапейскай перспектывы для краін Усходняга партнёрства» // http://npbelarus.info/?p=2153

2015/05/19. Заява Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства напярэдадні Саміту Усходняга партнёрства ў Рызе «Геапалітычны крызіс у рэгіёне: патрэба і выклік для рэфармавання ініцыятывы «Усходняе партнёрства» // http://npbelarus.info/?p=2302